СУСТРЭЧЫ

# ДОБРАЙ ТРАДЫЦЫІ ПЛЁН

**ЛІДА. Літаратары Лідскага раёна выступілі перад ваеннаслужачымі пагранічных войскаў.**

У кастрычніку бягучага года адбыўся шэраг творчых сустрэч прадстаўнікоў Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) з воінамі-пагранічнікамі. У літаратурна-грамадскіх мерапрыемствах на пагранічных заставах і ў воінскіх часцях сваю творчасць прадэманстравалі паэты Ірына Маркевіч, Людміла Краснадубская, Канстанцін Якубчык, Андрэй Гарадовіч, Ганна Рэлікоўская, Уладзімір Глінін і іншыя творцы. Напрыклад, Канстанцін Іосіфавіч Якубчык і Ірына Уладзіміраўна Маркевіч прадэманстравалі сваю паэтычную творчасць на пагранічнай заставе Драбішуны.

Падчас сустрэч паэтаў з вайскоўцамі прагучалі творы грамадзянска-патрыятычнай, філасофскай, духоўнай, інтымнай лірыкі на беларускай і рускай мовах. Мастацтва роднага слова выклікала ў аўдыторыі шчырую зацікаўленасць. Адбыліся сяброўскія гутаркі, атмасфера якіх была цёплай і добразычлівай.

Нагадаем, што сустрэчы беларускіх літаратараў і воінаў-пагранічнікаў сталі добрай традыцыяй. Яны адбываюцца на працягу некалькіх гадоў згодна з дасягнутай дамоўленасцю паміж Саюзам пісьменнікаў Беларусі і Дзяржаўным пагранкамітэтам Рэспублікі Беларусь.

Вынікам доўгатэрміновага супрацоўніцтва з’яўляецца моцнае сяброўства і ўзаемнае натхненне творчых людзей і абаронцаў дзяржаўнай граніцы.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** паэты Лідчыны, члены Лідскага раённага літаратурнага аб’яднання «Суквецце» (кіраўнік паэт Уладзімір Глінін) падчас выступленняў перад ваеннаслужачымі пагранічных войскаў. Кастрычнік 2025 года.




Выступае паэт Уладзімір Глінін





Выступае Ірына Маркевіч







Выступае Андрэй Гарадовіч


ГОСУДАРСТВЕННЫЕ
СИМВОЛЫ
ПРЕЗИДЕНТ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
УГОЛОК
ИСТОРИИ
1234